[1] Ф о с т е р У. Октябрьская революция и Соединенные Штаты Америки. М., 1958. С. 7.

[2] См.: Marx heute. Pro und contra. Hamburg, 1983.

[3] См.: L e o n h a r d W. Was ist Kommunismus? Wandlungen einer Ideologie. München; Gütersloh; Wien, 1976; Lenin — Politik und Philosophie. Bochum, 1982; Критика буржуазных фальсификаций основных проблем курса истории КПСС. Л., 1987.

[4] Л е н и н В. И. Полн. собр. соч. Т. 34. С. 332—333.

[5] См.: Исторический опыт трех российских революций. Книга третья: Коренной поворот в истории человечества: Великая Октябрьская социалистическая революция. М., 1987.

[6] Программа Коммунистической партии Советского Союза. М., 1986. С. 6.

[7] Ш а х н а з а р о в Г. Х. Социализм и будущее. М., 1983. С. 19.

[8] B e r g H. Marxismus-Leninismus: das Elend der halb deutschen halb russischen Ideologie. Köln, 1986. S. 11.

[9] Л е н и н В. И. Полн. собр. соч. Т. 36. С. 457.

[10] См.: G e y e r D. Die Russische Revolution: historische Probleme und Perspektiven. Göttingen, 1985. S. 84; Die Sowjetunion 1917—1977. Bonn, 1977. S. 3; L o r e n z R. Die Massen in der russischen Revolution 1917 // Die russische Revolution 1917: Der Aufstand der Arbeiter, Bauern und Soldaten. München, 1981. S. 33; S c h a e f e r A. Lenin, 1917: Eine Aufklärung der Machtergreifung durch Lenin-Texte. Berlin, 1980.

[11] Р о м а н о в с к и й Н. В. Критика фальсификаций роли ленинской партии в трех революциях. М., 1979. С. 238.

[12] Г о р б а ч е в М. С. Октябрь и перестройка: революция продолжается. М., 1987. С. 3.

У. Ф. ІЛЬЮХІН

# ДЗЕЙНАСЦЬ КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ ПА ПАВЫШЭННЮ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАГА ЎЗРОЎНЮ РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ (1961—1970)

Рэалізацыя стратэгічнага курсу паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны патрабуе далейшага ўдасканалення дзейнасці камсамола, актывізацыі яго ўдзелу ў выхаванні моладзі. «Камсамол павінен настойліва развіваць працоўную і грамадскую актыўнасць юнакоў і дзяўчат, фарміраваць у іх марксісцка-ленінскі светапогляд, палітычную і маральную культуру, свядомасць гістарычнай адказнасці за лёсы сацыялізма і міру»[1].

Развіццё працоўнай актыўнасці залежыць ад цэлага раду фактараў, у тым ліку і ад агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі маладых работнікаў, якая дазваляе ім на аснове вывучэння вопыту папярэдніх пакаленняў «рабіць вывады, узяць з вопыту сёння гістарычныя ўрокі, якія спатрэбяцца заўтра»[2].

Асноўнай формай атрымання ведаў моладдзю, што занята на вытворчасці, у разглядаемы перыяд было вячэрняе і завочнае навучанне. XXII з'езд партыі накіраваў сістэму народнай адукацыі перабудавацца такім чынам, каб працоўныя маглі «спалучаць работу ў сферы вытворчасці з працягам вучобы і адукацыі ў адпаведнасці з асабістым прызваннем і патрэбнасцямі грамадства». Падкрэсліўшы ўзрастанне ролі камсамола як самадзейнай арганізацыі моладзі, якая дапамагае партыі выхоўваць маладое пакаленне, уцягваць яго ў практычнае будаўніцтва новага грамадства, з'езд указаў, што адно з цэнтральных месц у рабоце камсамольскіх арганізацый павінна займаць «...павышэнне ўзроўню адукацыі і тэхнічных ведаў юнакоў і дзяўчат»[3].

XII Пленум ЦК ВЛКСМ, які праходзіў у лістападзе 1961 года, абавязаў абкомы, крайкомы, ЦК ЛКСМ саюзных рэспублік распрацаваць канкрэтныя меры па аказанню дапамогі органам народнай адукацыі ва ўздыме агульнаадукацыйнага ўзроўню ўсіх занятых у народнай гаспадарцы.

Выконваючы ўказанні партыі і рашэнні ЦК ВЛКСМ, камсамольскія арганізацыі рэспублікі правялі пэўную работу па прапагандзе вячэрняга і завочнага навучання, камплектаванню школ рабочай моладзі (ШРМ), стварэнню ўмоў для паспяховага сумяшчэння вучобы і працы. Аднак не ўсюды гэтая работа разгортвалася актыўна. Так, у жніўні 1962 года бюро ЦК ЛКСМ Беларусі разгледзела пытанне «Аб нездавальняючай падрыхтоўцы да новага навучальнага года ў школах рабочай і сельскай моладзі і сеткі камсамольскай палітасветы ў Мінскай вобласці». Указаўшы на слабую растлумачальную работу, адсутнасць належнага кіраўніцтва і патрабавальнасці з боку абласнога, гарадскіх і раённых камітэтаў камсамола, бюро абавязала іх сумесна з органамі народнай адукацыі распраца-

ваць гадавыя і перспектыўныя планы вучобы маладых работнікаў, забяспечыць безумоўнае выкананне народнагаспадарчага плана набору навучэнцаў у ШРМ, удзяліўшы асаблівую ўвагу моладзі без васьмігадовай адукацыі [4].

Камсамольскія арганізацыі вобласці, ліквідуючы адзначаныя пастановай недахопы, разам з органамі народнай адукацыі правялі рэйды па высвятленню агульнаадукацыйнага ўзроўню камсамольцаў і моладзі, стану камплектавання вячэрніх і завочных школ. Шырока практыкаваліся сустрэчы маладых вучоных з выпускнікамі ШРМ, кіраўнікамі прадпрыемстваў, вучонымі, якія набылі адукацыю без адрыву ад вытворчасці. На многіх прадпрыемствах пачалі выпускацца спецыяльныя насценныя газеты, прысвечаныя школе і вучобе, былі арганізаваны выступленні педагогаў па заводскаму радыё, вечары ў ШРМ. Мінскі АК ЛКСМБ для аказання дапамогі маладым рабочым у вывучэнні асобных прадметаў прыцягнуў студэнтаў ВНУ. Так, камсамольцы БДУ імя У. І. Леніна стварылі кансультацыйныя пункты ў заводскіх інтэрнатах камвольнага камбіната і МАЗа, студэнты БПІ праводзілі заняткі з рабочымі радыёзавода, камітэт камсамола медыцынскага інстытута ўзяў шэфства над навучэнцамі ШРМ № 10. Усё гэта дазволіла значна палепшыць камплектацыю вячэрніх (зменных) школ і выканаць народнагаспадарчы план прыёму навучэнцаў з ліку працуючай моладзі. Толькі ў Мінску ў 1962/63 навучальным годзе да заняткаў прыступіла 13 982 маладых рабочых, што на 2 тыс. больш, чым прадугледжвалася планам. У цэлым па вобласці кантынгент навучэнцаў школ рабочай моладзі павялічыўся ў параўнанні з 1961 годам з 17 872 чал. да 25 865 чал.[5]

Віцебскі, Гродзенскі АК ЛКСМБ, Магілёўскі, Баранавіцкі гаркомы, некаторыя райкомы камсамола выкарысталі такія традыцыйныя формы работы па заахвочванню моладзі да вучобы ў ШРМ, вячэрніх і завочных ВНУ і тэхнікумах, як уручэнне ва ўрачыстай абстаноўцы камсамольскіх пуцёвак на вучобу, правядзенне дэкад і дзён ведаў, адкрытых камсамольскіх сходаў і г. д. Для тых, хто паступае ў вячэрнія і завочныя школы, камітэты камсамола арганізавалі на прадпрыемствах падрыхтоўчыя курсы і пункты, якія аказвалі дапамогу тым, хто меў вялікі разрыў у вучобе. У 1963—1964 гадах у Гродзенскай вобласці дзейнічала 15 такіх пунктаў з колькасцю 600 чал., у Віцебскай — 17 з агульным ахопам 472 чал.[6]

Актывізацыі работы камсамольскіх органаў па ўцягненню юнакоў і дзяўчат у ШРМ садзейнічалі рэспубліканскія агляды агульнаадукацыйнай і культурна-тэхнічнай падрыхтоўкі працуючай моладзі, якія праводзіліся па ініцыятыве ЦК ЛКСМБ, Прэзідыума Белсаўпрофа, СНГ БССР і Міністэрства асветы БССР. Найбольш арганізавана прайшоў адзін з такіх аглядаў у 1963/64 навучальным годзе. За час яго правядзення, дзякуючы сумесным намаганням адміністрацыі, прафсаюзаў, камсамола і органаў народнай адукацыі, удалося вырашыць многія пытанні па ўмацаванню матэрыяльнай базы вячэрніх (зменных) і завочных школ, стварэнню неабходных умоў для тых, хто вучыўся без адрыву ад вытворчасці. У выніку кантынгент навучэнцаў у школах рабочай моладзі павялічыўся на 6700 чал.[7]

У многіх пярвічных камсамольскіх арганізацыях прамысловасці, будаўніцтва і транспарту склалася пэўная сістэма павышэння агульнаадукацыйнага ўзроўню маладых рабочых. Заслугоўвае ўвагі вопыт работы камітэта камсамола завода штучнага валакна імя Куйбышава г. Магілёва, які будаваўся на цесным кантакце з адміністрацыяй цэхаў і аддзелаў, аддзелам падрыхтоўкі кадраў, заводскай камісіяй садзейнічання навучэнцкай моладзі, дырэкцыяй ШРМ, хіміка-тэхналагічнага тэхнікума і дэканатам вячэрняга аддзялення машынабудаўнічага інстытута. Дзейсную падтрымку імкнення моладзі да далейшай вучобы, устанаўленне пастаяннага кантролю за якасцю ведаў і наведваннем заняткаў камітэт камсамола звязваў са стварэннем спрыяльных умоў для працы, быту і адпачынку рабочых-навучэнцаў, іх маральным і матэрыяльным заахвочваннем. Маладым рабочым, якія паспяхова сумяшчалі работу з вучобай, у першую чаргу даваліся месцы ў інтэрнатах, дзіцячых садах і яслях, павышаліся вытворчыя разрады. На заводзе стала добрай традыцыяй праводзіць у канцы навучальнага года вечары маладых рабочых, якія вучыліся без адрыву ад вытворчасці. Мэтанакіраванай работай камітэт камсамола дабіўся таго, што ў 1967 годзе з 706 чал. камсамольскага ўзросту без адрыву ад вытворчасці вучылася: у ШРМ — 110 чал., у тэхнікумах — 248 чал., у ВНУ — 224 чал.[8] У выніку значна ўзрасла прадукцыйнасць працы моладзі, умацавалася яе

працоўная дысцыпліна. Усе маладыя работнікі выконвалі вытворчыя заданні, многія актыўна ўдзельнічалі ў рацыяналізатарскай дзейнасці.

Паляпшэнню вячэрняга і завочнага навучання маладых работнікаў вытворчасці садзейнічала прынятая ў красавіку 1967 года пастанова Прэзідыума ВЦСПС, ЦК ВЛКСМ і Міністэрства асветы СССР «Аб рабоце прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый і органаў народнай адукацыі па павышэнню агульнаадукацыйнага ўзроўню моладзі, занятай у народнай гаспадарцы»[9].

У мэтах аказання дзейснай дапамогі педагагічным калектывам, устанаўлення сістэматычнага кантролю за станам вучэбна-выхаваўчага працэсу, умацавання сувязей камсамола са школай пры вячэрніх ШРМ ствараліся нестатутныя камсамольскія арганізацыі. Толькі ў Гродзенскай вобласці ў 1968 годзе такія арганізацыі дзейнічалі ў 35 вячэрніх школах [10].

Добра зарэкамендавалі сябе створаныя пры некаторых абкомах, гаркомах і райкомах камсамола няштатныя аддзелы па арганізацыі агульнаадукацыйнай вучобы працуючай моладзі, якія праз шырокі камсамольскі актыў праводзілі вялікую агітацыйна-прапагандысцкую работу, умацоўвалі шэфскія сувязі паміж камітэтамі камсамола прамысловых прадпрыемстваў і вячэрнімі школамі, сачылі за якасцю вучобы.

У практыку камітэтаў ЛКСМБ пачалі ўваходзіць перыядычныя справаздачы сакратароў і загадчыкаў аддзелаў школьнай моладзі, сумесныя семінары-нарады з прадстаўнікамі органаў народнай адукацыі, на якіх вялікая ўвага ўдзялялася каардынацыі намаганняў камсамола і педагагічных калектываў у барацьбе за паляпшэнне вячэрняга і завочнага навучання рабочай моладзі.

Узаемадзеянне камсамольскіх арганізацый з органамі народнай адукацыі, а таксама актыўная дапамога партыйных, савецкіх і прафсаюзных органаў станоўча адбіліся на паляпшэнні работы вячэрніх і завочных школ і росце іх кантынгенту за кошт маладых рабочых. У 1970 годзе такой формай навучання ў рэспубліцы было ахоплена 122,8 тыс. чал., у тым ліку 101,9 тыс. вучыліся ў 9—11 класах. Кожны чацвёрты атэстат аб сярэдняй адукацыі ўручаўся выпускнікам, якія закончылі вучобу без адрыву ад вытворчасці [11].

Але поўнасцю вырашыць праблемы вячэрняга і завочнага навучання рабочай моладзі ў разглядаемы перыяд не ўдалося. Нягледзячы на тое, што значная колькасць моладзі, занятай на вытворчасці, не мела магчымасці павышаць свой адукацыйны ўзровень, з сярэдзіны 60-х гадоў у рэспубліцы пачалося неабгрунтаванае скарачэнне сеткі вячэрніх школ. Калі ў 1965/66 навучальным годзе ў БССР дзейнічала 1495 школ рабочай і сельскай моладзі, то ў 1970/71 — толькі 521 разам з самастойнымі завочнымі школамі [12].

Крайне марудна ажыццяўляліся меры па ўмацаванню матэрыяльнай базы вячэрніх школ, што адмоўна адбівалася на рацыянальнай арганізацыі ў іх навучальнага працэсу. Абсалютная большасць ШРМ размяшчаліся ў памяшканнях дзённых школ, многія з якіх былі перагружаны і працавалі ў дзве змены, таму заняткі «вячэрнікаў» нярэдка пачыналіся ў 19.30 і заканчваліся каля першай гадзіны ночы. Толькі лічаныя адзінкі школ рабочай моладзі размяшчаліся ва ўласных будынках. Напрыклад, у 1965 годзе ў Мінскай вобласці з 61 самастойных ШРМ такіх было толькі дзве [13].

Многія гаспадарчыя кіраўнікі, прыкрываючыся «вытворчай неабходнасцю», парушалі пастанову партыі і ўрада аб прадастаўленні льгот рабочым-навучэнцам. Так, больш чым на палавіну зніжалася зарплата маладым рабочым, якія вучыліся ў вячэрніх школах, на аўтабазе № 4 і ў паравозным дэпо Ліды; не прадастаўляліся водпускі на перыяд экзаменаў у БУ-87, аўтатрэсце і некаторых прамысловых прадпрыемствах Гродна; зніжаліся тарыфныя разрады на Луненскім цагляным заводзе. Кіраўнікі Скідзельскага і Шчучынскага райпрамкамбінатаў, Салігорскага завода ЖБВ, мэблевай фабрыкі, прыборабудаўнічага і станкабудаўнічага заводаў Маладзечна звальнялі навучэнцаў з работы без асаблівых на тое прычын, пераводзілі ў нязручныя змены, затрымлівалі на звышурочных работах і адпраўлялі ў працяглыя камандзіроўкі.

Пры камплектаванні ШРМ усё часцей сталі прымяняцца адміністрацыйныя метады, калі ў пагоні за ўсеагульным ахопам ігнараваліся індывідуальны падыход да кожнага канкрэтнага чалавека, яго асабістыя інтарэсы, здольнасці, матэрыяльныя ўмовы, сямейнае становішча і г. д.

Усе гэтыя недахопы адбіваліся на захаванні кантынгента школ рабочай моладзі і якасці навучання. Высокім заставаўся адсеў навучэнцаў (у розныя гады ён складаў па рэспубліцы 20,4 — 18 %, а ў некаторых школах дасягаў 30 — 40 %). Вострай была праблема паспяховасці. Так, напрыклад, з 615 маладых рабочых Мінскага аўтамабільнага завода, якія займаліся ў ШРМ № 5 і № 16 у 1966 годзе не паспявала і не было атэставана па двух і больш прадметах 119 чал., г. зн. амаль кожны пяты. Некаторыя навучэнцы не паспявалі па 3 — 5 прадметах [14].

У ліку прычын такога становішча не апошняе месца займалі сур'ёзныя недахопы, фармалізм і інертнасць у рабоце тых камітэтаў камсамола, для якіх пытанні павышэння агульнаадукацыйнага ўзроўню маладых работнікаў вытворчасці зводзіліся да прыняцця шматлікіх пастаноў і складання «столевых» справаздач. У дакладных запісках Мінасветы БССР і ЦК КПБ неаднаразова адзначалася недастатковая работа Гродзенскага АК ЛКСМБ, Барысаўскага ГК, Рэчыцкага, Смаргонскага райкомаў камсамола, якія не ажыццяўлялі належнага кантролю за выкананнем прымаемых рашэнняў па арганізацыі вучобы рабочай моладзі, у выніку чаго большасць з гэтых рашэнняў так і не ўвасобілася ў канкрэтныя справы.

Асобныя камсамольскія арганізацыі, правёўшы кампанію па камплектацыі ШРМ і зрабіўшы справаздачу па яе выніках перад вышэйстаячымі інстанцыямі, лічылі на гэтым сваю работу закончанай і зусім не займаліся сістэматычным аналізам прычын нізкай якасці ведаў, рэдка цікавіліся станам спраў у вячэрніх школах, праяўлялі абыякавасць да патрэб моладзі, якая вучылася без адрыву ад вытворчасці. Амаль не практыкавалася вылучэнне на адказныя ўчасткі работы юнакоў і дзяўчат, якія закончылі вячэрнія школы. У радзе выпадкаў самі актывісты не паказвалі асабістага прыкладу камсамольцам і моладзі ў авалоданні ведамі.

Несвоечасовае выяўленне і ліквідацыя адзначаных недахопаў не маглі не адбіцца на эфектыўнасці праводзімай камітэтамі камсамола работы па фарміраванню ў моладзі імкненняў да няспыннай адукацыі, а калі глядзець глыбей, то і на зніжэнні аўтарытэту камсамола як арганізацыі, якая заклікана адстойваць інтарэсы моладзі.

На дзейнасці рэспубліканскай камсамольскай арганізацыі па павышэнню агульнаадукацыйнага ўзроўню рабочай моладзі адбіліся і негатыўныя тэндэнцыі, якія пачалі складвацца ў нашым грамадстве ў даследуемы перыяд. Адміністрацыйна-камандны стыль кіраўніцтва, арыентацыя ўсёй дзейнасці дзяржаўных, партыйных органаў і грамадскіх арганізацый на колькасныя паказчыкі, «бюракратычны цэнтралізм» наклалі свой адбітак на стыль, метады і формы работы камітэтаў камсамола. Пераадоленне адзначаных недахопаў немагчыма без карэннай перабудовы ва ўсіх сферах жыцця краіны, у тым ліку ў дзейнасці камсамола, які павінен рашуча адмовіцца ад залішняй цэнтралізацыі, ад усяго, што не вытрымала праверкі практыкай, абудзіць ініцыятыву і самадзейнасць камсамольцаў, апіраючыся на ўсё лепшае, што было ў мінулым.

[1] Материалы XXVII съезда Коммунистической партии Советского Союза. М., 1987. С. 162.

[2] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 9. С. 208.

[3] Материалы XXII съезда КПСС. М., 1961. С. 413, 402.

[4] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 63, воп. 7, спр. 116, арк. 64.

[5] ЦДАКР БССР. Ф. 42, воп. 5, спр. 985, арк. 331; спр. 987, арк. 2.

[6] Там жа. Спр. 1118, арк. 7.

[7] Там жа.

[8] ПА Магілёўскага АК КПБ. Ф. 24, воп. 14, спр. 3, арк. 60, 61, 78—80.

[9] Справочник партийного работника. М., 1967. С. 466.

[10] ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 20, воп. 19, спр. 1, арк. 9.

[11] Гл.: Народное хозяйство Белорусской ССР в 1986 г. Минск, 1987. С. 213; Знамя юности. 1970. 27 февр.

[12] Гл.: Народное хозяйство Белорусской ССР в 1970 г. Минск, 1971. С. 329; Народное хозяйство Белорусской ССР в 1986 г. С. 213.

[13] ЦДАКР БССР. Ф. 42, воп. 5, спр. 910, арк. 345; спр. 1179, арк. 98.

[14] ЦДАКР БССР. Ф. 42, воп. 5, спр. 1179, арк. 96; спр. 1182, арк. 6; ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 586, воп. 1, спр. 64, спр. 31; ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 262, воп. 17, спр. 3, арк. 65.